


**Марфа Рабкова** – каардынатарка Валанцёрскай службы Праваабарончага цэнтра “Вясна”, сябра “Вясны”, студэнтка ЕГУ.

Пры яе актыўным удзеле былі арганізаваныя дзесяткі назіранняў за мірнымі сходамі грамадзянаў, праведзеныя маніторынгі больш за 100 судовых пасяджэнняў па адміністрацыйных справах над затрыманымі ўдзельнікамі мірных акцый, арганізоўваліся трэнінгі для новых валанцёраў.

У 2020 годзе Марфа Рабкова займалася наборам і навучаннем кароткатэрміновых назіральнікаў для кампаніі “Праваабронцы за свабодныя выбары”. Падчас і пасля выбарчай кампаніі актыўна ўдзельнічала ў арганізацыі дапамогі рэпрэсаваным актывістам і іх сем’ям, брала ўдзел у дакументаванні сведчанняў ахвяраў катаванняў і здзекаў з боку сілавікоў у першыя дні пратэстных акцый.

17 верасня Марфа Рабкова была затрыманая ў Мінску супрацоўнікамі ГУБАЗіК. Ёй прад’яўленае абвінавачванне па ч. 3 арт. 293 Крымінальнага кодэкса - “навучанне ці іншая падрыхтоўка асобаў для ўдзелу ў масавых беспарадках, альбо фінансаванні такой дзейнасці”.

ПЦ “Вясна” расцэньвае крымінальны пераслед Марфы як палітычна матываваны і звязаны з яе праваабарончай дзейнасцю.

У абарону Марфы Рабковай выступілі беларускія і міжнародныя праваабарончыя арганізацыі, у тым ліку Amnesty International, Front Line Defenders, Абсерваторыя па абароне праваабаронцаў, Платформа грамадзянскай салідарнасці, ПЦ “Вясна”, Беларускі Хельсінкскі Камітэт, Беларускі дом правоў чалавека імя Барыса Звозскава, Прававая ініцыятыва, Беларуская асацыяцыя журналістаў, Human Constanta ды шмат іншых.

Марфа Рабкова прызнаная палітзняволенай і вязнем сумлення.

**Падпішыце Марфе Рабковай паштоўку ці напішыце ліст на адрас:**

**СІЗА №1, вул. Валадарскага, 2, г. Мінск, 220030**

**Рабковай Марыі Аляксандраўне**